**398.** Складзіце колькасна-іменныя словазлучэнні з лічэбнікамі *паўтара*, *паўтары* і прыведзенымі назоўнікамі.

Тона, стагоддзе, гадзіна, кіламетр, лыжка, літр, цэнтнер.

Запішыце словазлучэнні ў форме творнага склону.

## § 64. Скланенне, ужыванне і правапіс зборных лічэбнікаў

**Зборныя** лічэбнікі ***двое, трое, чацвёра, пяцёра, шасцёра, сямёра, васьмёра, дзявя́цера, дзեся́цера*** абазначаюць колькасць прадметаў як сукупнасць, адно цэлае.

Зборныя лічэбнікі ўжываюцца:

- з назвамі асоб мужчынскага полу: *сямёра спартсменаў*;
- з назвамі маладых істот: *чацвёра шчанят*;
- з назоўнікамі, якія ўжываюцца ў форме толькі множнага ліку: *двое нажніц*;
- з назоўнікамі *дзеці, людзі, коні, гусі, свінні*;
- з асабовымі займеннікамі: *іх было трое*;
- з прыметнікамі, якія перайшлі ў назоўнікі: *двое дзяжурных*.

**399.** Складзіце і запішыце колькасна-іменныя словазлучэнні, выбраўшы з дужак назоўнікі, якія спалучаюцца са зборнымі лічэбнікамі.

Пяцёра[сл] (*жанчыны, дзеці*), трое (*дзверы, сталы*), васьмёра (*качаняты, качкі*), двое (*мастакі, мастачкі*), чацвёра (*быкі, коні*).

**400.** Прачытайце табліцу.

| Склон | Скланенне зборнага лічэбніка |
|---|---|
| Н. | *пяцёр[а] шэр[ых] кацянят* |
| Р. | *пяцяр[ых] шэр[ых] кацянят* |
| Д. | *пяцяр[ым] шэр[ым] кацянятам* |
| В. | *пяцяр[ых] шэр[ых] кацянят* |
| Т. | *пяцяр[ымі] шэр[ымі] кацянятамі* |
| М. | *(аб) пяцяр[ых] шэр[ых] кацянятах* |

Дакажыце, што зборныя лічэбнікі скланяюцца, як прыметнікі множнага ліку.



Правообладатель Национальный институт образования

**401.** Утварыце ад колькасных лічэбнікаў, якія абазначаюць цэлыя лікі, зборныя. Запішыце іх у склонавай форме, указанай у дужках.

Узор: *8 (Р.) — восем — васьмёра, васьмі — васьмярых.*

6 (Д.), 3 (Т.), 5 (М.), 2 (Р.), 4 (Т.), 9 (Д.), 7 (М.).

Да зборных лічэбнікаў адносяцца лічэбнікі ***абодва, абедзве, абое.***

Лічэбнік *абодва* спалучаецца з назоўнікамі мужчынскага і ніякага роду: *абодва ўнукі, абодва крэслы*; лічэбнік *абедзве* — з назоўнікамі жаночага роду: *абедзве ўнучкі, абедзве канапы.*

Лічэбнікі *абодва, абедзве* скланяюцца, як лічэбнікі *два, дзве.*

Для абазначэння асоб і мужчынскага, і жаночага полу ўжываецца лічэбнік *абое*: *Маці з сынам абое сядзелі на тапчане* (І. Чыгрынаў).

**402.** Праскланяйце адно з колькасна-іменных словазлучэнняў, якія прыводзяцца ў тэксце правіла ў якасці прыкладаў.

**403.** Прачытайце сказы, выбіраючы з дужак патрэбныя лічэбнікі. Абгрунтуйце свой выбар.

1. Выбраўся з начных хмар поўны месяц, і лес па *(абодва/абедзве)* бакі дарогі адразу пачарнеў, як сцяна *(А. Федарэнка)*. 2. Слабы водсвет[ф] пранікаў сюды толькі з *(абодвух/абедзвюх)* канцоў калідора *(З. Бядуля)*. 3. Вясною, як ападзе паводка, і летам на *(абодвух/абедзвюх)* берагах успыхвае рознакаляровы пажар кветак *(З. Прыгодзіч)*. 4. У баі загінулі адважны Рагвалод і *(абое/абодва)* яго сыны *(У. Бутрамееў)*.

● Які сказ адпавядае прыведзенай схеме?
[═══ ───], і [─── ═══].



Правообладатель Национальный институт образования

**404.** Прачытайце тэкст, ужываючы лічэбнікі, што ў дужках, у патрэбнай склонавай форме. Назавіце сродкі сувязі сказаў у тэксце.

Па алеях праходзяць людзі, то заклапочаныя, то вясёлыя, то задуменныя. Мая ўвага спынілася на *(трое)*.

Па дарожцы да аэрадрома ішла жанчына, высокая, светлавалосая, у прыгожай стракатай сукенцы. Па баках у жанчыны ішло двое юнакоў. Адзін, старэйшы, гадоў *(дваццаць тры)*, высокі, танклявы. Другі крышку маладзейшы[м], шыракаплечы. На *(абодва)* хлопцах былі новенькія, з іголачкі, касцюмы, бялюткія кашулі. І абодва такія сімпатычныя! Адразу было відаць, што юнакі — браты, а жанчына — іх маці *(Паводле Л. Арабей)*.

Растлумачце значэнне фразеалагізма *з іголачкі*.
Зрабіце пісьмовы марфалагічны разбор трох лічэбнікаў з тэксту, карыстаючыся парадкам і ўзорам разбору, прыведзенымі на форзацы.

**405.** Выканайце інтэрактыўнае заданне па тэме «Спалучэнне лічэбнікаў з назоўнікамі».

## КАНТРОЛЬНЫЯ ПЫТАННІ І ЗАДАННІ

1. Што абазначае лічэбнік як часціна мовы?
2. На якія разрады падзяляюцца лічэбнікі ў залежнасці ад значэння і граматычных прымет? Прывядзіце ўласныя прыклады.
3. На якія разрады падзяляюцца лічэбнікі ў залежнасці ад будовы?
4. Як можа перадавацца значэнне прыблізнай колькасці? Прывядзіце ўласныя прыклады.
5. З назоўнікамі якога роду ўжываюцца лічэбнікі ***паўтара*** і ***паўтары, абодва*** і ***абедзве***?
6. З якімі назоўнікамі спалучаюцца зборныя лічэбнікі?

**406.** Пісьмова адкажыце на пытанні. Лікі запішыце словамі.

Калі ў нашай краіне адзначаюцца наступныя дзяржаўныя святы: Дзень Канстытуцыі, Дзень Перамогі, Дзень Незалежнасці?

Калі беларусы святкуюць Дзень жанчын, Дзень ведаў, Дзень маці?

Лічэбнікі якога разраду паводле значэння і граматычных прымет вы выкарысталі?



Правообладатель Национальный институт образования

***Звярніце ўвагу!***

Першае слова ў састаўных назвах свят пішацца з вялікай літары: ***Новы год***, ***Свята працы***, ***Дзень настаўніка***.

**407.** Устаўце ў фразеалагізмы прапушчаныя кампаненты — колькасныя лічэбнікі.

| **Фразеалагізм** | **Разрад прапушчанага лічэбніка** | **Значэнне фразеалагізма** |
|---|---|---|
| Як свае ... пальцаў | абазначае цэлы лік | ‘вельмі добра, грунтоўна, да дробязей (ведаць, вывучыць)’ |
| На сваіх ... | зборны | ‘пехатой, пешшу’ |
| Ні два ні ... | дробавы | ‘такі, які нічым не вызначаецца’ |
| На ... градусаў | абазначае цэлы лік | ‘вельмі рэзка, карэнным чынам (павярнуць, перавярнуць і пад.)’ |
| ... рабое | зборны | ‘абсалютна аднолькавыя, адзін не лепшы за другога’ |

Д л я д а в е д к і: *паўтара, абое, пяць, сто восемдзесят, двое.*

Складзіце і запішыце сказы з двума фразеалагізмамі (на выбар).

**408.** Спішыце сказы, выбіраючы з дужак правільную форму лічэбніка і ўстаўляючы, дзе трэба, прапушчаныя літары.

1. Пячора была досыць в..лікая: метры тры на тры і вышынёю каля *(дзвюх/двух)* метраў *(У. Караткевіч)*. 2. На галаве ..ужа, з *(абедзвюх/абодвух)* бакоў, дзве жоўты.. плямкі *(В. Вольскі)*. 3. У нашай пушч.. расце дзевяц..сот[м] відаў раслін, *(дзве трэція/дзве трэціх)* з якіх — лекавыя *(Я. Сіпакоў)*. 4. Мы з Шураю ра..крываем сэр..ы адна адной гэтак шчыра і горача, што *(абодвум/абедзвюм)* нам хочацца плакаць *(А. Васілевіч)*.

**409.** Прачытайце тэкст. Чаму Брэсцкі чыгуначны вакзал называюць варотамі нашай краіны ў Еўропу?

Чыгуначны вакзал Брэста — вароты нашай краіны ў Еўропу. **Адкрыццё** будынка вакзала адбылося 28 мая 1886 года. **Брэсцкі**



Правообладатель Национальный институт образования

чыгуначны вакзал наведвалі манархі і кіраўнікі ўрадаў розных краін, пісьменнікі і артысты, скульптары і касманаўты.

У 2014 годзе завяршылася рэканструкцыя пасажырскага комплексу вакзала станцыі Брэст-Цэнтральны. З'явіліся **добраўпарадкаваныя** паркоўкі, прасторная цэнтральная зала чакання на 240 пасадачных месцаў, утульныя нумары адпачынку.

Сёння вакзал станцыі Брэст-Цэнтральны ўваходзіць у лік помнікаў архітэктуры Беларусі, з'яўляецца «музеем мармуру пад адкрытым небам».

З перона вакзала кожныя суткі адпраўляюцца 25 пар цягнікоў **рэгіянальных** ліній, 15 — міжрэгіянальных і 15 — міжнародных. Кожны месяц яго паслугамі[c] карыстаюцца каля 300 тысяч пасажыраў *(Паводле С. Расолькі)*.

Якую ролю ў тэксце выконваюць лічэбнікі?

Выпішыце з тэксту спачатку колькасна-іменныя словазлучэнні з колькаснымі лічэбнікамі, затым — з парадкавымі. Лікі запішыце словамі. Абазначце ў словазлучэннях галоўныя словы.

● Назавіце арфаграмы ў выдзеленых словах.

**410.** Разгледзьце фрагмент анлайн-табло станцыі Мінск-Пасажырскі.

**Мінск-Пасажырскі — Брэст-Цэнтральны**
**Расклад цягнікоў**

| Нумар | Маршрут | Адпраўленне | Прыбыццё | Час у дарозе | Дні курсіравання |
|---|---|---|---|---|---|
| 307Б | Саратаў → Брэст | 05.47 | 10.09 | 4 г 22 хв. | цотныя |
| 649Б | Магілёў → Брэст | 05.47 | 10.09 | 4 г 22 хв. | няцотныя |
| 661Б | Віцебск → Брэст | 07.53 | 12.05 | 4 г 12 хв. | няцотныя |
| 727Б | Мінск → Брэст | 10.12 | 13.54 | 3 г 42 хв. | штодзённа |
| 103Н | Новасібірск → Брэст | 11.44 | 16.16 | 4 г 32 хв. | пятн., нядз. |
| 737Б | Мінск → Брэст | 13.00 | 17.00 | 4 г | штодзённа |

Карыстаючыся змешчанай на табло інфармацыяй, вызначце, якім цягніком вам трэба выехаць з Мінска, каб прыбыць у Брэст у чацвер 14 чэрвеня да 15 гадзін. Запішыце словамі нумар цягніка, час яго адпраўлення і прыбыцця, час у дарозе.

**411.** Выканайце тэматычную тэставую работу па раздзеле «Лічэбнік».



Правообладатель Национальный институт образования